# Мае Юравічы

**На гэтую назву — «Мае Юравічы» — я маю ўсе правы. Таму што, колькі сябе помню, столькі памятаю гэтае мястэчка. Там нарадзілася мая маці Галубовіч Ірына Антонаўна і да 2013 года жылі мае родныя па матчынай лініі. На гары, каля езуіцкага касцёла і калегіума (сёння мужчынскі манастыр) жылі браты бабулі Молі — Міша і Юзік Луцкевічы, а зусім побач з калегіумам жыла бабуліна мачаха Люня (Юзэфа). Галінкі бабылюнінай грушы звісалі на бок калегіума. Звісаюць яны і сёння, хаця самой бабы Люні даўно няма. Апошнія гады свайго жыцця яна чытала малітву «Аб ніспасланні лёгкай смерці», але памірала вельмі цяжка у сваёй дачкі Гэлі ў Гомелі.**

*Зміцер Давідоўскі*

Мае бацькі пачалі ездзіць у Юравічы, калі маёй старэйшай сятры Марыі споўнілася паўгода. Спачатку жылі на сяле ў бабулі Паўліны, але неўзабаве пачалі здымаць хатку недалёка ад возера Ліцвін на Відолічах. Гэтая вуліца пачынаецца старажытнымі яўрэйскімі могілкамі, стаянкамі першабытнага чалавека, рэшткамі палаца і аўтастанцыяй. Побач з апошняй размяшчаліся крама і пошта. З пошты мы адпраўлялі ў Мінск сухія грыбы, рыбу і некаторыя рэчы, у якіх знікала патрэба. Па вяртанні забіралі свае пасылкі ўсёй сям'ёй, бо іх за нашу адсутнасць назбірвалася каля 10–12 фанерных паштовых скрынь вагой па 5–6 кілаграмаў кожная.

Сёння ў Юравічах на месцы першай стаянкі першабытнага чалавека будуецца краязнаўчы музей пад адкрытым небам. На рагу Відоліч і Казінаўкі жыла яўрэйская сям'я Целешаў, і я вельмі любіў гуляць з іх унукамі. Яны былі карэнныя юравічане, але іх моладзь на зіму з'язджала ў Ленінград. Цяпер прадстаўнікі гэтага роду жывуць у Ізраілі і ЗША. Стары Целеш кожную раніцу на снеданне свайму малодшаму ўнуку (не памятаю яго імя, як не памятаю і імёнаў астатніх членаў гэтай сям'і) з дробнакаліберная стрэльбы забіваў аднаго вераб'я. Такая была традыцыя. Жылі яны ў Юравічах з вясны да глыбокай восені. А мы з'язджалі з Юравіч у другой палове жніўня: бацькам трэба было на працу, а калі мы падраслі, то і нам — у школу. Бацька выкладаў вышэйшую матэматыку ў Інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі (сёння Беларускі Дзяржаўны аграрна–тэхнічны ўніверсітэт) і таму часта пакідаў нас на маці, бо быў членам прыёмнай камісіі і з'язджаў на ўступныя іспыты. У нашай сям'і адбывалася так, што бацькі адно аднаго мянялі, і толькі ў жніўні мы жылі разам.

Якое ў нас было прыгожае дзяцінства! Мы з маленства ўмелі лавіць рыбу і вудай, і спінінгам. Вудаю добра атрымлівалася ва ўсіх, а вось спінінгам лепш за ўсіх лавіў бацька. Ён мог закінуць яго пад «ракету» або параход і выцягнуць добрага шчупака ці судака. Аднойчы яму на донку трапіў падуст. Гэта донная рыба, яе верхні плаўнік падобны да плаўніка лятучай рыбы, але аднесена яна да карпавых. Бацька вельмі добра ведаў, як паводзіць сябе тая ці іншая рыба і калі яна лепш бярэцца на спінінг. Нам, сваім дзецям, ён расказваў, як лепш цягнуць шчупака, судака і іншых рачных драпежнікаў.

У дзяцінстве я бачыў і юравіцкія кірмашы, праслаўленыя Іванам Мележам. Акурат 25 чысла кожнага месяца на плошчы каля аўтастанцыі адбывалася сапраўднае свята. Жанчыны апраналіся ў саматканыя строі, мужчыны — у кашулі–вышыванкі і саламяныя капелюшы. Гандляры з'язджаліся адусюль: з Мазыра, Калінкавіч, Нароўлі, Куранёў, Глінішч, Байца, Шарэек, Прудка і іншага наваколля. На тым кірмашовым свяце можна было пазнаць амаль усіх мележаўскіх герояў: Васіля Дзятліка, Ганну Чарнушку, Глушакоў, Міканора, Хадоську, Апейку, Шабету.

Настолькі былі яны выразныя — наяве, а не ў рамане пісьменніка, што міжволі ў памяці ўсплывалі старонкі «Палескай хронікі». Гандлявалі жаночай і мужчынскай вопраткай і абуткам, парсюкамі, каровамі, гладышамі, драўляным посудам, тканінай — усім. Лягчэй пералічыць, чаго на тых кірмашах не было. І гандляры так умела, з такім добрым гумарам прапаноўвалі свой тавар, што сорамна было сысці без пакупкі. Мы заўсёды нешта ды набывалі — ці гладыш, ці чыгунок, ці нешта з народных промыслаў. Вось у каго трэба было вучыцца майстэрству гандлю — у простага селяніна. На тых кірмашах былі так званыя зазывалы, якія бегалі з нейкімі вяртушкамі і з іх дапамогай клікалі людзей на кірмаш. Як убачыць такі зазывала новага пакупніка, так абавязкова і растлумачыць яму, што да чаго і ў каго лепш купляць той ці іншы тавар. Такіх зазывал было некалькі, яны павінны былі ахапіць усе бакі свету. Нібыта яны маглі склікаць народы свету на гэты кірмаш. Але з гэтымі зазываламі трэба было трымаць вуха востра. Бо разам з якасным таварам яны маглі прапаноўваць і няякасны. Таму ў дачыненні да іх дзейнічала нешта накшталт заводскага АТК — аддзела тэхнічнага кантролю. Былі такія народныя кантралёры, якія сачылі за тым, каб ніхто няякасны тавар не пранёс ці каб нейкі зазывала чаго–небудзь пакупніку не набрахаў. І калі заўважалі нешта падобнае, то адразу каралі. Самым непрыемным было выгнанне з кірмаша. Але пры мне такога ні з кім не здаралася.

Вельмі маляўнічае і запамінальнае гэта было відовішча: гумар, пляскі, песні, жарты тут і там. Не было толькі боек ды сварак, усё праходзіла вельмі прыстойна. Сёння, на вялікі жаль, патрэба ў такіх кірмашах адпала: у Юравічах працуе некалькі вялікіх крам. А плошча перад аўтастанцыяй пустуе, пакрытая летам зялёнай травой, зімой — снегам. Нават дарогу правялі не праз яе, а побач. Захавалі як помнік.

Юравічы мелі яшчэ адну славутасць — пякарню. У ёй працавала жанчына. Гэта была вялікая майстрыха. Хлеб, які яна пякла, падабаўся ўсім, развозіў яго на кані нейкі дзетдомавец. На павозцы стаяў драўляны фургончык з надпісам «Хлеб». На вялікі жаль, яна не здолела перадаць сваё май-



Мама і Нюся.

стэрства каму–небудзь з вяскоўцаў. Пасля яе смерці пякарню раскідалі, а мы з бацькам хадзілі на тое месца капаць чарвякоў ды розных лічынак для рыбалкі. Напрыклад, на лічынку авадня вельмі добра лавіўся акунь, а на тлустага дажджавога чарвяка — лешч, плотва, карась і іншыя рыбы.

Летам 1973 года (гэта быў апошні год, калі мы ўсё лета стала жылі ў Юравічах, пазней толькі бывалі праездам) нас адпачывала дзесяць чалавек, і ўсе на Стоміным падворку. Нашымі гасцямі былі сябры: цёця Люся (Людміла Іванаўна Сарафанава) і яе сын Ігар Соскін, Люба Фрэнкель, Міла і Якаў Сакаленкі і цёця Ліза (Лізавета Данілаўна Валковіч, дачка расстралянага Старшыні Савета Міністраў БССР у 1937–1938 гг. Валковіча Данілы Іванавіча). Дарослыя са мной жылі ў нашай хатцы, а Маша, Ігар і Любачка — у нашай двухмеснай палатцы, якая стаяла пад дзічкай. Пазней прыехаў мамін супрацоўнік Андрэй Сапун з сям'ёй, але ён жыў не з намі, а на Казінаўцы, мы пра гэта загадзя дамовіліся з гаспадарамі. 10 жніўня 1973 года мы адзначалі 50–годдзе нашай цёткі Лізы. Маша, Ігар і Любачка таемна ўзялі ключ ад лодачнага замка і прыкладна а пятай гадзіне раніцы таго дня пайшлі на Ліцвін, адвязалі лодку і пераплылі на ёй возера. На тым беразе нарвалі белых гарлачыкаў, прычым, ірвалі іх асцярожна і каб сцябліны былі як мага даўжэй. Сплялі з іх вялізны, прыгожы і досыць важкі вянок. Вярнуліся, прывязалі лодку і прыйшлі дамоў. Іх адсутнасці ніхто не заўважыў. Паклікалі ўсіх на двор, пасадзілі цётку Лізу на пералаз і павесілі ёй на шыю гэты вянок з гарлачыкаў. Нам было вельмі весела. І вось пасярод смеху і жартаў прыходзіць Андрэй Сапун: «Привет, колхознички. Вам тут хаханьки, а я на пузе сижу». Можаце сабе ўявіць тагачасную якасць дарог, калі такі танк, як «Волга» ГАЗ–21 сеў на пуза. Усё наша мужчынскае насельніцтва пайшло вызваляць Андрэя з бяды. Што толькі ні рабілі, якія прылады ні прымянялі — усё безвынікова. І тут едзе нейкі вясковец на трактары МТЗ–50. Убачыў такую сітуацыю, моўчкі дастаў свой трос, пачапіў адзін канец на трактар, другі — на «Волгу» і без натугі машыну выцягнуў. У той час людзі вельмі ахвотна, па ўласным жаданні ішлі адно аднаму на дапамогу. І дапамагалі бескарысліва, па закліку сэрца, а не пад нечым прымусам або за грошы. Сёння мы амаль страцілі гэтую якасць. І вельмі шкада.



З Матронай Савішнай.

За наступныя сорак гадоў жыцця цёткі Лізы такога цікавага, рамантычнага і вясёлага дня нараджэння ў яе не здарылася. Памерла яна ў 90–гадовым ўзросце 21 лістапада 2013 года.

Я ўжо пісаў у сваіх папярэдніх артыкулах, што маці мая хадзіла на паляванне. У Юравічах яна пазнаёмілася з настаўнікам фізічнай культуры мясцовай школы Аркадзем. Выглядала гэтае знаёмства наступным чынам. Ішлі мы па заліўным Прыпяцкім лузе ўчатырох: я, мая сястра Маша, мама і тата. Мама была апранутая ў вайсковую кашулю, запраўленую ў штаны. За плячыма ў яе была стрэльба «Simiens». Гэта была бескуркоўка. Куркі былі схаваны ўнутр, а ў стрэльбах вясковых паляўнічых яны размяшчаліся над ствaламі. Аркадзь нас заўважыў і падышоў, звяртаючыся да маці з наступнымі словамі: «Гляджу я на вас і не магу нічога зразумець: па вопратцы хлопец, а па фігуры — жанчына. Пакажыце мне вашу стрэльбу. Ой, бескуркоўка. Вы ж толькі глядзіце ў майго сабаку не

ўлупіце!» На гэтых словах ў мамін бок паляцелі крыжанкі (самыя вялікія дзікія качкі). Мама ўскінула стрэльбу і стрэліла дуплетам — з абодвух ствалоў адразу. Дзве крыжанкі ўпалі на зямлю.

Паляўнічы сабака, з якім хадзіў Аркадзь, імгненна прынёс маме забітых ёю качак. Аркадзь у захапленні, ледзь стрымліваючы задышку ад хвалявання, прамовіў: «Дык у вас талент! Давайце хадзіць на паляванне разам». З таго часу мама, я (з падораным мне нейкім дзіцячым лукам), мая сястра Маша і тата хадзілі на паляванне разам з Аркадзем і яго Джэкам. Гэта быў цудоўны сабака. Ён вельмі добра ведаў сваю паляўнічую справу. І ніколі не было такога, каб Джэк прынёс забітую птушку некаму іншаму, а не таму, хто яе забіў. Ён і сам мог злавіць і задушыць качку. У гэтым выпадку нёс яе свайму гаспадару.

Мне добра ўрэзаўся ў памяць адзін момант. Ноччу ля вогнішча сядзелі найлепшыя юравіцкія паляўнічыя, сярод іх — мая мама. І нехта, ці то каб пасмяяцца з «нікчэмнай бабы», ці каб жорстка пажартаваць, выставіць яе нічога не вартым паляўнічым, прапанаваў: «Хто са стрэльбы адкрые бутэльку з шампанскім, ды так, каб на гарлавіне не было нават драпіны, той атрымае права першага стрэлу». Эх, не ведаў ён, з кім жартуе. Мужыкі сядзяць, адзін на аднаго паглядаюць, а маці ўставіла у адзін ствол жакан, здаецца, на ваверку. Існуе шмат жаканаў для палявання на розных жывёл — ад ваверкі да дзіка, лася, рысі і г. д. І гэтая вось «баба» стала на адно калена, шчыльна прыставіла да ключыцы прыклад і стрэліла ў корак. Корак — угору, жартаўнік — да бутэлькі. А на ёй — ані драпіны.



Каб вандроўнікі маглі з крынічкі напіцца, на меднай жэрдцы вісеў эмаліраваны кубак.

Тут жа стала зразумелай уся памылковасць зробленай прапановы. Усе юравіцкія паляўнічыя засталіся ў дурнях. І пачалі з павагай ставіцца да маёй мамы — не толькі як да жанчыны, але яшчэ і як да вельмі добрага паляўнічага. Прызналі-такі ў гэтай «бабе» сапраўдны паляўнічы талент.

Нашымі гаспадарамі былі Матрона Савішна і Мацвей Васільевіч, якога вяскоўцы звалі Стомам. Мы, значыць, былі Стоміны кватаранты. Колькі цікавага і неверагоднага пачуў я ад гэтых добрых старых людзей! Матрона Савішна вучыла мяне: «Дзімка, калі хто ў цябе кіне каменем, кінь у таго хлебам!» Якая мудрая народная парада. Ніколі не адказвай на зло злом, а толькі дабром. Бо толькі так адвучыш свайго крыўдзіцеля ад злых учынкаў.

Нейк у лесе мы ўбачылі рагатую гадзюку. Рог быў, як у насарога, толькі ў мініяцюры, а паміж вачэй — нібыта намаляваная карона. Прыйшоўшы з лесу, я расказаў пра такое стварэнне Матроне Савішне, а яна мне паведаміла наступнае: «Дзімка! Вам пашчасціла ўбачыць каралеву ўсіх змей. Калі мая Маня (дачка Матроны Савішны) вельмі цяжка захварэла, а дактары не маглі даць рады, я пачала шукаць, дзе жыве каралева змей. Чула я ад сваіх бацькоў, што калі перад каралевай змей разаслаць шарсцяную хустку і на яе пакласці акраец жытнёвага хлеба, то яна скіне на хустку свой рог. Тады неабходна імгненна падняць хустку з рогам і бегчы дахаты, ды як можна хутчэй, і пры гэтым не азірацца, бо калі азірнуцца — каралева нападае імгненна, а яд у яе мацней за яд каралеўскай кобры. Самае галоўнае — каб змяіная каралева цябе не дагнала, бо калі дагоніць, загінеш

і ты і тваё дзіця. Доўга шукала я месца яе жыхарства. Але знайшла. Разаслала хустку з жытнім хлебам перад яе хаткай, і яна хуценька выпаўзла на хустку, схапіла хлеб і скінула сваю карону–рог. Я падхапіла хустку і шпарка пабегла, завязваючы яе на вузел, да сваёй хаты. Каралева за мной. Але я хутчэй за яе. Як ўскочыла ў хату — не памятаю. Але добра памятаю, як разаслала хустку з рогам побач з калысачкай маёй Мані. Дачушка даволі хутка акрыяла. Стала на ногі, вырасла і гадуе, дзякуй Богу, сваіх дзетак». Вось такую цікавую гісторыю расказала мне Матрона Савішна. Мы з сястрой яе запісалі і адправілі ў часопіс «Юный натуралист». Атрымалі ўзнагароду — фотаапарат «Смена».

Наша хатка была нахіленая набок і складалася з кухні і спальні. І там і там столь была падпёртая бервяном. У кухні стаяла руская печ, а ў спальні пры сценах — два самаробныя тапчаны з дошак, на якіх ляжалі вялікія матрацы–сеннікі, набітыя сухім плюшкам (аерам). Водар ад іх ішоў неверагодны. Былі ў нашай хатцы і сенцы, на кроквах і пад дахам якіх жылі кажаны і ластаўкі. А пад падлогай хаткі жыла сямейка вужоў. Маша з імі гуляла, як з лялькамі, і ледзь не цалавала. Вужакі выпаўзалі на пясчаную прызбу і грэліся там на сонейку.

Каля нашай хаткі быў пералаз, зроблены з бярозавага бярвення. Прыкладна ў дзесяці метрах ад яго расла груша–дзічка, вакол якой трохкутнікам былі складзены дошкі. Далей — новы дом гаспадароў, за ім — іх першы дом, у якім стаялі тры вялікія дубовыя бочкі з бярозавым квасам. У першай — жытнія сухары з сушанымі дзічкамі, у другой — жытнія сухары з сушанымі слівамі–венгеркамі, у трэцяй — толькі жытнія сухары. Ва ўсіх бочках паверх усяго ляжаў вялікі пласт праpраслага жыта (гэта абараняла квас ад цвілі), а на краі кожнай бочкі вісела па меднаму кубку. Кожны бярозавік меў сваё прызначэнне: з грушамі і слівамі — для піцця, а з аднымі толькі жытнімі сухарамі — для гата-



Палатка наша была двухмесная. Сёння дзіву даешся, як мы ўчатырох у ёй памяшчаліся.

вання халадніка. Але мы бралі піць з усіх бочак. Квас быў вельмі смачны і вельмі халодны — тая хата была ў іх замест халадзільніка.

Прыкладна ў дзвюх сотнях метраў ад нашага селішча стаяла зялёнага колеру драўляная праваслаўная царква (стаіць яна і сёння), пабудаваная ў 1951 годзе. У гэтай царкве служыў вельмі хітры бацюшка. Прыняўшы прыход, ён перш–наперш даведаўся ад вяскоўцаў, хто ў іх самы добры грыбнік. Яму сказалі: «Паўліна». І пачаў ён, як той кот, хадзіць ціха за маёй бабай Паўлінай і такім чынам выведаў усе яе грыбовішчы. І кожны раз, калі а чацвёртай гадзіне раніцы мы збіраліся ісці па грыбы і бацька заўважаў, як бацюшка таксама ідзе з кашом у лес, то казаў нам наступнае: «Во, бачыце поп–злыдзень у лес па грыбы пабег. Я пабег за ім, а вы ідзіце ў напрамку "Паўлініных горак"». Мы ішлі па іх слядах і збіралі тыя грыбы, якія яны ў шалёнай гонцы прапусцілі. І менавіта на «Паўлініных горках» сустракаліся. Тата і бацюшка сядзелі супакоеныя на схіле і чысцілі грыбы, якія яны бралі абы–як, з чым папала, абы толькі адзін аднаго па колькасці перагнаць. Такія грыбныя спаборніцтвы цягнуліся гады тры ці чатыры і спыніліся з прычыны смерці бацюшкі, бо той, хто яго змяніў, разумеў, што ў гэтым лесе ніхто без грыбоў не застанецца, таму ні за кім і не бегаў, і не сачыў. Мы між сабой жартавалі: «Каб не стамляцца, трэба перад сабой пускаць камбайн». Але жарты жартамі, а грыбы там і сапраўды можна было хоць касой касіць. Яны раслі вялікімі сем'ямі, так званымі ведзьмінымі кругамі, па 30–50 штук у крузе. Неяк мне пашчасціла знайсці «ведзьмін круг» белых,



Бацька вельмі добра ведаў, як паводзіць сябе тая ці іншая рыба і калі яна лепш бярэцца на спінінг.

у якім я налічыў 48 штук. У Юравічах існавала наступная градацыя грыбоў: грыб (белы), асінавік (падасінавік), суравежка (сыраежка), масленік (масляк), а астатнія — проста казлякі. Лісічкі вяскоўцы называлі жыдоўскім грыбам. Чаму — не ведаю.

Насупраць нашай аднабокай хацінкі быў пясчаны абшар, дзе на невялікім узгорку рос малады сасоннік. І калі нам на снядание знянацку хацелася смажаных баравікоў ці грыбнога супу на абед, то беглі мы ў гэты лясок, зразалі там 10–15 чорнагаловікаў, а іх хапала і на суп, і насмажыць са шкваркамі і смятанай. У Юравічах так тады гаварылі: «Грыб каля хаты — гэта не грыб. За ім пабегаць трэба». Таму ўсе беглі глыбей ў лес. Дарэчы, у вяскоўцаў існавала такая прыкмета: калі Паўліна паўкораба грыбоў нясе, у лес ісці не варта, а калі яна ідзе з поўным корабам грыбоў за плячыма, — бяжы ў лес. Мая баба Паўліна і ў вайну хадзіла ў лес па грыбы. Хаця гэта было небяспечна, можна было загінуць ад кулі, выпадковай партызанскай або нямецкай.

Трэба яшчэ сказаць, што калі мы вярталіся ў Мінск з 5–6 кілаграмамі сушаных белых, то гэта значыла, што прыехалі мы без грыбоў. Тое самае датычылася і рыбы. Звычайна мой тата бег на Ліцвін а чацвёртай гадзіне раніцы са спінінгам і а шостай ужо прыносіў 10–15 добрых рыбін — шчупакоў і акунёў. На плоце каля нашай хацінкі вісела рукамыйніца, пад ёй стаяля драўляная лаўка, такая ж старая, як і хацінка. І вось каля гэтай лаўкі адбываўся сапраўдны цуд. Прынясём мы ці бацька рыбу і пачынаем яе чысціць. У гэты момант каля нас нікога няма. Але як толькі мы ўспорвалі бруха першай рыбіне, каля лаўкі збіраліся каты з усяго навакolля. За парадак "адказваў" Стомін кульгавы шэры кот. Ён сачыў за тым, каб усім хапіла рыбных



З Аркадзем і яго Джэкам.

вантробаў ці смаркачоў — так у Юравічах называюць яршоў і насароў. І ніколі не было такога, каб каты пачалі біцца за ежы. Мы вельмі любілі назіраць за гэтай кацінай сталоўкай. Жывёлы вучылі нас, людзей, сапраўднаму этыкету.

Шчупакі з Ліцвіна былі вельмі прыгожыя: з залацістымі палоскамі. З Затокі, ці Вусця — са светла-зялёнымі ды ружовымі разводамі. Афарбоўка залежала ад колеру прыбярэжнай травы і водарасцей, якія раслі на тым месцы, дзе шчупака злавілі. Акуні чамусьці былі амаль чорныя.

Белыя грыбы добра раслі не толькі ў сасновым лесе, які цягнуўся ўздоўж Ліцвіна ў бок Шарэек, але і на так званай дубіне́. Дубіно́й звалі дубовы гай, але дубы там былі кустарнікавыя. Ісці ў дубіну трэба было паўз маляўнічае возера Грыбнае. У яго была адна вельмі карысная асаблівасць. Каля самага берага біла чысценькая крынічка. І, каб вандроўнікі маглі з яе напіцца, на меднай жэрдцы вісеў эмаліраваны кубак. Непакоіць смага — калі ласка: вось кубак, вось крынічка — пі, пакуль не нап'ешся. Ісці да Грыбнага трэба было праз поплаў, а паколькі ўсе мы хадзілі басанож, то ішлі асцярожненька, увесь час глядзелі пад ногі, каб не на наступіць на пчалу, ці асу, ці чмяля: поплаў проста гудзеў на розныя галасы, а мы баяліся не столькі болю, колькі таго, што, не хочучы, задушым маленькую і вельмі карысную істоту.

Памятаю такі выпадак. Ішлі мы, як заўсёды, басанож, на Грыбнае. І тут нашу ўвагу прыцягнула гадзюка. Паводзіла яна сябе дзіўна, нетрадыцыйна. Мы сталі, як завarожаныя, і пачалі назіраць. А яна сабралася ў гармонік, потым як спружына распрамілася — і частка яе скуры засталася па-за ёй. Потым яшчэ і яшчэ раз сабралася і распрамілася. І так пакуль уся старая скура з яе не злезла. Якая яна тады стала прыгожая! Яе міжволі захацелася гладзіць. Але мы добра разумелі, з кім маем справу. Ад укусу гадзюкі мы не памерлі б, тым больш, што сярод нас была мама-ўрач. Але непрыемнасцей нажылі б дастаткова. Мама хацела забраць гэтую скуру дадому ў якасці сувеніра, але бацька не дазволіў ёй гэта зрабіць. І растлумачыў вельмі цікава: «Іра! Нельга людзям браць старую змяіную скуру, бо яна на сабе нясе шкоду і зло. Тое, што мы прысутнічалі пры цудадзейным моманце, ужо вялікае шчасце, але чапаць скуру — значыць наклікаць на сябе вялікія беды». Так і засталася тая скура ляжаць пры дарозе. А мы рушылі далей, да Грыбнага. Па дарозе мама палявала на качак, а мы елі суніцы і любаваліся наваколлем. Нездарма наша Палессе называюць Беларускай Швейцарыяй.

Памятаю, прыехалі мы чарговы раз ў Юравічы і па сваёй старой звычцы спачатку зайшлі да бабы Паўліны: паказаць, што мы ўжо ў Юравічах, і, галоўнае, паразмаўляць з разумным чалавекам. Бабуля Паўліна вельмі любіла і шанавала майго бацьку Міколу. І вось пры той сустрэчы яна, звяртаючыся да таты, сказала: «Коля! Калі пойдзеце ў лес, там ля туфля (была ў Юравіцкім лесе такая мясціна, дзе на ўзгорку ляжала напалову згнілы жаночы туфель) маладзенькая гадзючка гуляе, дык не спужайце!» Вось такое было яднанне з прыродай. Вяскоўцы ставіліся да прыроды як да маці. Яна ж іх і паіла, і карміла. Ніколі не было такога, каб хто-небудзь з вяскоўцаў нанёс асяроддзю нейкую шкоду. Да і прыезджыя, назіраючы за

мясцовымі, імкнуліся прыроду шанаваць.

Але вернемся на падворак Стомы. Памятаю, адбыўся ў мяне выпадак з сабакам Матроны Савішны. Прыехалі мы на лета ў Юравічы і толькі зайшлі на двор, як мне захацелася па патрэбе. А перад гэтым Мацвей Васільевіч памяняў вартавога сабаку. Вось Матрона Савішна мне і кажа: «Дзімка! Ён у нас вельмі злы — парвецъ». Падумаў я, але ўсё ж пайшоў. Падышоў да будкі Жука (так звалі новага сабаку) і… Ён адзін раз толькі цяўкнуў, пасля завіляў хвастом і лізнуў мяне ў далонь. Матрона Савішна са смехам прамовіла: «Ну, ты, відаць, ведаеш нейкую замову». З таго часу Жук хадзіў з намі ў лес. Мы нясём дровы — і ён нясе ў зубах добры дрын. Куды мы, туды і ён. Вось так мы жылі з гэтым «вельмі злым сабакам». Мы не бралі яго толькі на Прыпяць і калі ішлі жыць у дубіну з палаткай. Палатка наша была двухмесная з цёмна–зялёнага брызенту. Сёння толькі дзіву даешся, як мы ўчатырох у ёй змяшчаліся, ды яшчэ і месца заставалася на аднаго чалавека. У дубіну мы ішлі паражняком, а бацька на лодцы–пласкадонцы вёз усе нашы рэчы. Маршрут яго быў такі: Ліцвін, Затока, Вусце, Прыпяць і, нарэшце, дубіна. Усе разам выцягвалі лодку на бераг, а пасля разгрузкі напаўнялі яе вадой. Потым у лодку кідалі вылаўленую з ракі рыбу. Бераг Прыпяці ў гэтым месцы быў вельмі круты, і ў ім жылі ластаўкі–берагавушкі. Увесь бераг быў усыпаны гнёздамі. Да ракі вяла вузкая сцежка. Мы па ёй спускаліся да вады. Рыбу лавілі вудамі, спінінгам і на донку. Донка — гэта рыбалоўная прылада, якая робіцца з самай тоўстай і моцнай лёскі, на канец прывязваюцца самаробнае важкае свінцовае грузіла і даволі вялікі трайны кручок з жыўцом ці іншай нажыўкай — усё залежыць ад таго, якую рыбу хочаш злавіць. Закідваецца яна вельмі далёка, аж на сярэдзіну рэчкі. Лёска замацоўваецца на палачцы, каб была ўвесь час напятая. Да лёскі прыладжваецца невялічкі званочак, які пачынае звінець толькі тады, калі рыбіна клюне. Выцягваючы рыбу на бераг, спяшацца не трэба, але і марудзіць таксама не варта. Выцягваць неабходна з роўнай хуткасцю — толькі тады рыба апынецца на беразе. Звычайна мы ставілі 4–5 донак — на драпежнікаў і на іншых рыб. У нашым рыбалоўным арсенале быў і падсак — прылада для выцягвання на бераг буйной рыбы. Ім мы карысталіся заўсёды.

Аднойчы здарыўся ў дубіне такі выпадак. Увечары бацька налавіў рыбы, выразаў сцізорыкам з лазінкі раздвоеную галінку, пачапіў на яе свой улоў і павесіў на куст. Леглі мы спаць, а раніцай вырашылі падсмажыць ўчарашнюю рыбу на вогнішчы. Вылезлі з палаткі — і бачым, як з абрывістага берага ў Прыпяць сігае драпежніца–выдра. Паглядзелі мы на бацькаў вячэрні улоў і ўбачылі толькі аб'едкі. Мы пасмяяліся з вынаходніцтва выдры, а бацька сказаў словы Дэрсу Узала з аднайменнай аповесці Уладзіміра Арсеньева: «Другой людь, приходи ешь». Калі я ўспамінаю наша жыццё на Прыпяці, то адначасова ўспамінаю і тое, як бацька запякаў у вогнішчы рыбу. Пад вогнішчам вырывалася яма, шчыльна высцілалася дубовымі галінкамі, на іх клалася рыба, накрывалася, зноў жа, галінкамі, засыпалася пяском, а зверху распальвалася вогніш-



Звычайна тата бег на Ліцвін а чацвёртай раніцы са спінінгам і а шостай ужо прыносіў 10–15 добрых рыбін.

ча. Дубовыя галінкі давалі частку свайго водару, які перамешваўся з рыбным, і смак атрымліваўся цудоўны.

Жылі мы так каля двух тыдняў, потым вярталіся да гаспадароў. Увесь тэрмін жыцця на беразе мы бралі малако у кашары. Кашара — гэта такі вялікі, агароджаны металічным дротам, праз які пускаўся слабы ток, загон для калгаснага статка.

А цяпер да гісторыі месца. Юравічы ўпершыню згаданы ў 1170 годзе пад назвай Міжмосце. Гэта быў невялікі горад, які ў 1240 годзе спалілі татары. На папялішчы паўстаў замак Відолічы, які таксама ворагі знішчылі. У пісьмовых дакументах 1430 года паселішча згадваецца пад назвай горад Юр'еў. Як сведчыць паданне, у горадзе Юр'еве быў знойдзены абраз Божай Маці.

У 1510 годзе ў «Літоўскай метрыцы» Юравічы ўпершыню згаданы пад сучаснай назвай. А ў 1680 годзе была пабудавана капліца езуітаў — як часовы дом для святога абраза Маці Божай Юравіцкай «Міласэрнай». Пра з'яўленне цудадзейнага абраза існуе такая легенда. На ўзгорку (над стаянкай першабытнага чалавека) расла вялікая груша, і на ёй ў 1600 годзе з'явіўся цудадзейны абраз Божай маці. Яго заўважыла нейкая жанчына і адразу пабегла з гэтай навіной да ксяндза. Той сабраў жыхароў і разам з імі пайшоў паглядзець на цудоўную з'яву. Калі падняліся да грушы з цудадзейным абразом, ксёндз сказаў, што чапаць яго нельга. Ён павінен сам вызначыцца з месцам свайго новага знаходжання. Праз некалькі дзён цудадзейны абраз вандраваў паміж слупом на гары і той самай грушай, на якой ён з'явіўся. Гэтым ён паказаў тое месца, на якім хоча быць. Тады вырашылі наступнае. Незамужнія маладыя жанчыны павінны легчы жывым шляхам ад грушы да выбранага абразом месца на гары, і па гэтым жывым шляху павінна прайсці дзіця–інвалід з абразом у выцягнутых руках. Так было зроблена. Па жывым шляху з жанчын прайшла сляпая дзяўчынка з цудадзейным абразом Божай Маці «Міласэрнай» у руках. І калі яна замацавала на слупе цудадзейны абраз, да яе зрок вярнуўся. Яна пачала бачыць так, нібыта ніколі сляпой не была. Пасля на месцы слупа пабудавалі капліцу. Паводле легенды, груша расла больш за сто год. І толькі пасля таго як ксёндз даў дазвол, гэтую грушу спілавалі і падзялілі на кавалкі паміж усімі жыхарамі Юравіч. У маёй бабы Паўліны ў куфары ляжаў невялікі кавалак той святой грушы. Ён пераходзіў у спадчыну ад пакалення да пакалення.



Аўтар артыкула ў часе сваіх успамінаў.

Пабудавана капліца ў 1680 годзе, а ў 1710–м пачалося будаўніцтва каменнага езуіцкага касцёла з калегіумам. Доўжылася яно больш за сорак гадоў. У 1746 годзе езуіцкі касцёл і калегіум былі адкрытыя. Прыблізна з 1750 года пры касцёле дзейнічала школа, у якой навучаліся дзеці шляхты, мяшчан і сялян. Акрамя гэтага, дзейнічалі дзіцячы тэатр і бібліятэка. Асвечаны касцёл быў толькі 5 верасня 1758 года — пасля таго як канчаткова былі скончаныя работы па роспісе і ўнутраным яго аздабленні. Пабудавалі езуіцкі касцёл з калегіумам на месцы драўлянай каплічкі. Так цудадзейны абраз Маці Божай Юравіцкай «Міласэрнай» перабраўся ў каменны і вельмі ўтульны дом. Гэты комплекс існуе і цяпер. Праўда, нейкі час у ім знаходзіўся дзіцячы дом, у якім настаўнічала мая цётка Нюся (Ганна Сцяпанаўна Касьян). Нюсяй яе звалі з маленства. Калі ёй было гады тры ці чатыры, яна на пытанне «Як цябе

зваць?» адказвала: «Нюська». Так Нюсяй і засталася да самай сваёй смерці.

Гэты касцёл прастаяў некрануты аж да 1958 года. Ён перажыў усе войны: Айчынную вайну 1812 года, Першую сусветную і Вялікую Айчынную. На яго падворак не ўпала ніводнага снарада, ніводнай бомбы. Нават Савецкая ўлада яго не кранула. І толькі ў 1958 годзе старшыня Юравіцкага калгаса даў загад разабраць храм на цэглу. Разбурэнне доўжылася аж да 1970 года. Новы старшыня спыніў гэтае злачынства.

Пасля паўстання Кастуся Каліноўскага езуіцкі касцёл стаў праваслаўнай царквой. І сёння юравічане называюць пераробку праваслаўна-мураўёўскай, бо менавіта па загадзе графа Міхаіла Мікалаевіча Мураўёва касцёл змяніў свой статус з каталіцкага на праваслаўны. Але нават Мураўёў не рашыўся знішчыць абраз Маткі Божай Юравіцкай «Міласэрнай», які шанавалі як сваю святыню аднолькава і каталікі, і праваслаўныя. Гэты сумна вядомы граф у сваім загадзе асобным пунктам зрабіў акцэнт на яе захаванні.

У 1993 годзе будынкі езуіцкага касцёла і калегіума перадалі Тураўскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы і жаночаму манастыру. Жаночы манастыр праіснаваў да верасня 2005 года, а потым быў перароблены ў Свята-Раства-Багародзіцкі Юравіцкі мужчынскі манастыр.

У красавіку 2006 года , калі пачалася буйная рэстаўрацыя, у так званым ніжнім храме адкапалі абраз Маці Божай Юравіцкай «Міласэрнай». Яго менавіта адкапалі, бо быў ён засыпаны зямлёй. Яго ачысцілі, паднавілі пазалоту, адрэстаўравалі. Але паўстае пытанне: ці сапраўды гэта той цудадзейны абраз? Бо добра вядомы факт, што ў XIX стагоддзі Ядзвігай Кяневіч была зроблена яго дасканалая копія. Менавіта яе ўставілі ў аклад арыгінальнага цудадзейнага абраза і наноў асвяцілі як цудадзейны. Арыгінал жа абраза Габрыеля Горват звезла ў Кракаў. Гэтая жанчына амаль два дзесяцігоддзі таемна захоўвала яго і ў маі 1885 года перадала на захаванне ў Кракаўскі храм Святой Барбары з умовай, што, калі з'явіцца магчымасць, ён будзе вернуты на пастаяннае сваё месца ў Юравічы. Гэты абраз і сёння захоўваецца ў Кракаве ў асобнай каплічцы пры храме Святой Барбары. Але рэстаўратары і эксперты развеялі ўсе крыватолкі. Яны далі адназначнае заключэнне, што адрэстаўраваны імі абраз — гэта адзін з арыгінальных, цудам захаваных, сапраўдных спісаў сярэдзіны XVIII стагоддзя абраза Маці Божай Юравіцкай «Міласэрнай», а не копія, зробленая Ядзвігай Кяневіч. Зусім розныя рэцэптуры фарбаў у знойдзенага абраза і ў работы Ядзвігі Кяневіч. А гэта сведчыць пра тое, што сёння Свята-Раства-Багародзіцкі мужчынскі праваслаўны манастыр мае сапраўдную цудадзейную святыню. З заключэннем рэстаўратараў не паспрачаешся. Але вельмі хочацца спадзявацца, што і першапачатковы спіс 1600-га ці 1630-га ў рэшце рэшт зойме пачэснае месца ў цалкам адрэстаўраваным храме. Сёння ён звонку амаль што адрэстаўраваны, але наперадзе шмат яшчэ працы па рэстаўрацыі ўнутраных памяшканняў, іх роспіс і г. д. Неабходна паднавіць некаторыя архітэктурныя ўпрыгожанні і дробныя дэталі. Я вельмі рады, што мае Юравічы набываюць сваё першапачатковае аблічча, якога я ў сваім дзяцінстве не бачыў.



Галінкі бабылюнінай грушы звісалі на бок калегіума. Звісаюць яны і сёння.